У 2019 годзе Пінск аб'яўлены культурнай сталіцай Беларусі

11 студзеня 2019 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне канверт з арыгінальнай маркай «Пінск — культурная сталіца Беларусі 2019 г.».

Марка. Палескі драматычны тэатр (будынак тэатра).

Ілюстрацыя. Пінск — культурная сталіца Беларусі 2019 г. (палац Бутрымовічаў, від на порт і езуіцкі калегіум, сабор Ушэсця Найсвяцейшай Дзевы Марыі, герб Пінска).

Мастак канверта і спецштэмпеля Таццяна Дольская. Дызайн Марыны Віткоўскай. Спецыяльнае памятнае гашэнне будзе праходзіць 25 студзеня ў аддзяленні паштовай сувязі № 16 Пінска Брэсцкай вобласці.

Пінск — раённы цэнтр Брэсцкай вобласці, горад з развітой інфраструктурай. Вядомы па Іпацьеўскім летапісе з 1097 года.

Па некаторых ацэнках, Пінск - другі ў Беларусі горад (пасля Гродна) па ліку захаваўшыхся помнікаў архітэктуры.

Лічыцца сталіцай Палесся. З'яўляецца месцам правядзення культурных мерапрыемстваў міжнароднага, рэспубліканскага і абласнога ўзроўняў.

Падрабязней на сайце РУП «Белпошта»

Source URL: *https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/09-01-2019-3938*